15. Сільчанка, М. У. Тэорыя крыніц беларускага права / М. У. Сільчанка. − Гродна : ГрДУ, 2012. − 253 с.
16. Чернецкая, Н. А. Информационное право / Н. А. Чернецкая. − Минск : Тетралит, 2014. − 143 с.
17. Чиченкова, О.С. К вопросу о формировании информационного права как самостоятельной отрасли права / О.С. Чиченкова // Проблемы правовой информатизации. – 2005. – №1. – С. 45-47.
18. Чиченкова, О.С. О праве собственности на информацию / О. С. Чиченкова // Проблемы правовой информатизации. – 2004. – № 1. – С. 74–76.
19. Шалаева, Т. З. Информационное законодательство Республики Беларусь: проблемы отраслевого строительства / Т. З. Шалаева // РИНТИ–2014, 20 ноября 2014 г. / сб. науч. матер. междунар. науч.-прак. конф. – Минск, 2014. – С. 136-143.

## ПОМНІК ГІСТОРЫІ ПРАВА Ў СУЧАСНЫМ ТЭАРЭТЫКА-ПРАВАВЫМ КАНТЭНЦЕ

М.У. Сільчанка (Мінск, Беларусь)

Статут 1566 года займае *асаблівае месца* сярод трох Статутаў Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага (далей – ВКЛ ці Вялікае княства Літоўскае) – знакамітых помнікаў права сярэдневяковай беларускай дзяржавы. У гісторыка-прававым плане Статут 1566года замацаваў змены ў сацыяльна-эканамічным развіцці грамадства пасля праведзенай у 50-х гадах XVI ст. зямельнай рэформы і ўнёс змены ў прававую сістэму, якія спатрэбіліся пасля змену судовым ладзе.У Статуце 1566 года былі замацаваны перадавыя на той час палажэнні аб прававым становішчы асобы іабмежаванні ўлады Вялікага князя, парасткі тэорыі падзелу ўладаў іпераўтварэння судовай улады ў самастойную галіну і інш [14].

У параўнанні са Статутам ВКЛ 1529 г. і тагачаснымі помнікамі еўрапейскага права Статут ВКЛ 1566 года вылучаецца незвычайнай структурай, якая сведчыць аб высокім ўзроўні прававой культуры стваральнікаў дадзенага помніка права [3, с. 137]. Інавацыйны характар будовы Статута ВКЛ 1566 года – вынік выкарыстання правілаўюрыдычнай тэхнікі і дасягненняў тагачаснай прававой дактрыны [20], найперш, тэарэтычных распрацовак рымскага і заходнееўрапейскага права [21, с.8].У Статуце 1566 годамы знаходзім элементы тэхнічнага рэгулявання і першыя айчынныя прававыя стандарты. Разгледзім гэтыя аспекты Статута ВКЛ 1566 года падрабязней.

***Структура Статута ВКЛ 1566 года – аснова для вызначэння яго прававой прыроды.***

Статуты ВКЛ 1529, 1566 і 1588гг. – настолькі ўнікальныя помнікі сярэдневяковага беларускага права, што сярод навукоўцаў не існуе паразумення адносна іх прававой прыроды. Статут 1529 г. параўноўваюць з канстытуцыяй феадальнага грамадства [1], а Статут 1588 года– з кодэксам [18]. Статут 1566 года прафесар Юхо І.А. назваў*самым дасканалым тагачасным Зводам законаў*[21, с.7]. Мы пагаджаемся з дадзенай думкай знакамітага прафесара. Аб тым, што Статут 1566 года быў*зводам законаў*,на наш погляд,сведчыць найперш яго адметная будова, якая дазваляе вылучыць гэты помнік праваз шэрагу падобных выданняўсістэматызацыйнага характару.

У склад Статута 1566 годаўваходзілі: 1) Віленскі Прывілей ад 8 чэрвеня 1563 г.; 2) Бельскі Прывілей ад 1 ліпеня 1564 г.;3) Віленскі Прывілей ад 30 снежня 1565 г.; 4) прэамбула да Статута ад 1 сакавіка 1566 года з указаннем аб увядзенні Статута ў дзеянне;5)тэкст уласна Статута 1566 года з дадаткамі да яго; 6) Пастанова (Ухвала) Берасцейскага Сойма ад 1 ліпеня 1566 з паправамі да Статута; 7) Пастанова Варшаўскага Сойма 1578 года з паправамі да Статута.Як бачна, Статут 1566 года складаўся з шэрагу адасобленых частак, якіябылі прыняты ў розны час, але ўспрымаліся тагачаснымі яго карыстальнікамі ў сістэмным адзінстве і толькі разам ўтваралі якасна новую крыніцу права.

Безумоўна, цэнтральная частка Статута 1566 года – гэта тэкст уласна Статута 1566года з прэамбулай і дадаткамі да яго. Калі для тагачасных помнікаў права прэамбула была звыклай часткай, то дадаткі, аб прававой прыродзе якіх размова пойдзе ніжэй, не сустракаюцца ў тагачасных помніках айчыннага права.

Асобная частка Статута 1566 года – папраўкі ў яго першапачатковы тэкст, які быў зацверджаны Бельскім Прывілеем 1564 года. Шэраг змен у першапачатковы тэкстСтатута былі ўнесены ўжо Берасцейскім Соймам 1 ліпеня 1566 года, г.зн. праз тры месяцыпасля ўвядзення Статута 1566 года ў дзеянне. Нагадаю, што ў прэамбуле да Статута 1566 года адзначаецца, што « … выдан есть сесь статутъ на сойме Виленскомъ великомъ валномъ, року Божъего нароженья тисеча пять сотъ шестьдесятъ шостого, месяца Марта, первого дня». Дата першага сакавіка і лічыцца пачаткам дзеяння Статута 1566 года.Наступныя папраўкі да першапачатковага тэксту Статута 1566 года былі зацверджаны Варшаўскім Соймам у 1578 годзе. Важна падкрэсліць, што папраўкі да Статута, якія былі ўхвалены на Берасцейскім Сойме 1566 года і Варшаўскім Сойме 1578 года, былі зроблены ў адпаведнасці з палажэннямі прэамбулы да Статута, згодна з якімі «…вси обыватели того панства нашого Великого Княства Литовского и вси земли ку нему належачіе будуть се радити и судити, *поправуючы и прибавляючы водле часу потребы артыкулов въ томъ статуте на соймехъ валных Великого Княства Литовского…*(выдзелена мной – М.С.)».

Змест Статута 1566 года, яго«дух і літару»нельга зразумецьбез прывілеяў, якія тэкстуальна папярэднічаюцьтэксту ўласна Статута.Прывілеі складалі *ўводную частку* да Статута 1566 года, палажэнні прывілеяў *праціналі*тэкст Статута і ляжалі ў падмурку разумення яго зместу ўсімі карыстальнікамі: Вялікім князем, панамі – радай, мясцовымі органамі ўлады, судамі і г.д. Аб ролі



Рэпазіторый ВДУ

прывілеяў у азначаным сэнсе сведчыць наступны факт. Пры зацвярджэнні Статута 1588 года кароль Польскі Жыгімонт Ваза на наступны дзень пасля каранацыі падпісаў прывілей аб зацвярджэнні Статута 1588 года, уякім прадпісваласязацвердзіць Статут *з прыкладаннем да яго земскіх прывілеяў.* Аднак Статут 1588 года быў надрукаваны без прывілеяў, бо паводле меркавання Л. Сапегі – складальніка Статута 1588 г. –«не ўсе яны падыходзяць (г.зн. феадалам Вялікага княства Літоўскага): у адных добры пачатак, а сярэдзіна кепская, у іншых – сярэдзіна добрая, а пачатак ці канец кепскі [15, с.548]»

Адначасова з уключэннем у склад Статута ВКЛ 1566 года прывілеі набылі большую юрыдычную значнасць і вагу. Адна справа, напрыклад, Віленскі Прывілей Вялікага князя ад 8 чэрвеня 1563 года аб ураўноўванні ў правах шляхты – некаталікоў з каталікамі, і зусім іншая – тэкст Статута ВКЛ, які хоць і зацвярджаўся Вялікім князем, але ж прымаўся вальнымСоймам. Гэта надавала палажэнням аб роўнасці правоў шляхты незалежна ад веравызнання большую вагу і значнасць. Вялікі князь не меў права аднаасобна змяніць тэкст Статута, уключыць у яго склад новыя прывілеі ці змяніць тэкстпрывілеяў, якія былі уключаны ў Статут. Забарона на такія дзеянні была замацавана ў раздз. 3 арт. 12 Статута 1566 года: *«Тежъ прирекаемъ вси привелея земскіе стародавные и ново отъ нас наданые волности и звычай добрый стародавный тымъ статутомъ нашимъ ховати и ни в чомъ ни нарушати, а нового ничого не встановляти.»*Цытуемы артыкул меў адпаведную назву: «О держаньюстарыхъ уставъ, а новых безъ сейму вального не встановляти»

Статут ВКЛ 1566 г.– унікальны помнік*усеагульнай* сістэматызацыіправа, якая ахоплівае прававую сістэму цалкам, усе яе сферы: права публічнае і прыватнае, матэрыяльнае і працэсуальнае, рэгулятыўнае і ахоўнае. Задачы ўсеагульнай сістэматызацыі права, згодна з сучаснымі дактрынальнымі напрацоўкамі [7] вырашаюцца якраз шляхам выдання звода законаў.

Ва ўмовах феадальнай дзяржавызвычайна праводзіліся рэформы асобных элементаў прававой сістэмы – дзяржаўнага, адміністрацыйнага, крымінальнага, зямельнага, сямейнага права і г.д., якія суправаджаліся выданнем адпаведнага прававога дакумента. Статут ВКЛ 1566 года падсумаваў змены ў асобных сферах прававой сістэмы тагачаснага беларускага грамадства, сістэматызаваў іх і ўзняў прававую сістэму грамадства на якасна новы ўзровень. У гэтых варунках цалкам справядлівай з’яўляецца выснова Л.Л. Голубевай аб тым, што «… з прыняццем Статута 1566 года кадыфікацыя і сістэматызацыя ўласнага заканадаўства ў значнай ступені апярэджвалі падобныя работы ў іншых феадальных дзяржавах<…> меліся юрысты, дастаткова падрыхтаваныя тэарэтычна і практычна [4, с. 45 - 46 ]».

УСтатуце 1566 года былі *сістэмна*выкладзены самыя важныя нормы дзяржаўнага, вайсковага, грамадзянскага, сямейнага, зямельнага, крымінальнага, працэсуальнага права. «*Сістэмная місія*»Статута 1566 года тычылася не толькі пісанага права, але і сферы звычаёвага права, таму што прыняцце Статута прывяло да пашырання сферы прававога рэгулявання грамадскіх адносін пісьмовымі крыніцамі.Такім чынам, тэндэнцыя пастаяннага пашырэння сферы заканадаўчагарэгулявання грамадскіх адносін, якая характэрна для развіцця сучаснага права[5],назіраецца і ў феадальным праве, асабліва ярка на прыкладзе буйных сістэматызаваных крыніц права. На наш погляд, суадносіны пісанага і звычаёвага права можна таксама разглядаць у якасці асобнай формысуадносінаў права і заканадаўства [9], праўда, зпапраўкамі на гістарычныя ўмовы.

Такім чынам, структурныя асаблівасці сістэматызацыйных выданняў з’яўляюцца ўніверсальнай прававой каштоўнаснасцю [10], якая дазваляе вызначыць прававую прыроду як сістэматызаваных крыніц сучаснага права [12], такі найважнейшых помнікаў гісторыі права.

***Тэхнічнае рэгуляванне ў Статуце 1566 года.***

У сучаснай сістэмесацыяльнага рэгулявання вылучаецца тэхнічны тып сацыяльнага рэгулявання. Пры гэтым падтэхнічным рэгуляваннем разумеюць сістэму тэхнічных норм і тэхналагічных правілаў, стандартаў [6], якія ўстанаўліваюць патрабаванні да вытворчай дзейнасці чалавека,гарантуюць яго бяспеку, скіраваны на ахову прыроды і навакольнага асяроддзя [17]. Працэс фарміравання тэхнічнага тыпу сацыяльнага рэгулявання быў імклівым. Яшчэ 300 – 400 гадоў таму ў прававых сістэмах сустракаліся асобныя элементы тэхнічнага рэгулявання, а сёння тэхнічныя імператывы вызначаюць накірункі і змест сацыяльнага рэгулявання цалкам [8].

Фарміраванне сістэмы тэхнічнага рэгулявання – працяглы працэс, ён падзяляецца на некалькі этапаў. На першасным этапе з’явілісяадзінкі і сістэмы вымярэння.«Для выражения и закрепления мыслей и действий, – адзначае Урванцаў Б.А., –люди начали изобретать <...>атрибуты измерений, счета, эквиваленты для обмена результатами труда, учитывать время и т.п.[19, с.11]». Без адзінак і сістэм вымярэння немагчыма ўсталяваць эквівалентнасцьу таварна-грашовых адносінах, вызначыць памер шкоды [13], аплаты працы, узнагароды і г.д., таму адзінкі вымярэння і заснаваныя на іх сістэмы вымярэння былі распаўсюджаны ў звычаёвым праве.

Без стварэння адзіных для дзяржавы адзінак вымярэння немагчыма было перадолець партыкулярнасць звычаёвага права і стварыць агульную прававую сістэму. *На жаль, уплыў сістэм вымярэння на развіццё права да цяперашняга часу ў юрыдычнай навуцы не даследаваны. Гэта праблема знаходзіцца на стыку прававой, эканамічнай навукі і навукі стандартызацыі і патрабуе комплекснага падыходу.*



Рэпазіторый БДУ

Статут ВКЛ 1566 года зрабіў крок наперад у справе замацавання адзіных для дзяржавы адзінак і сістэм вымярэння. У Статуце выкарыстоўваюцца старажытныя адзінкіі сістэмы вымярэння: пенязь –грош – капа грошаў (капа была роўная 60 грошам), альбо пенязь – грош – рубель. Пры гэтым капа выкарыстоўвалая для вымярэння самых розных рэчаў і ўключала 60 адзінак.Разам з тым у Статуце 1566 года замацоўваюцца новыя адзінкі і сістэмы вымярэння, якія з'явіліся ў выніку правядзення зямельнай рэформы: лан – валока – морг– прут (валока складала 21,36 га зямлі, морг – 0,71 га; лан быў роўны 3 валокам, 1валока складалася з9000 прутоў). У арт. 30 раздз. 3 Статута 1566 года ўстанаўліваецца*агульнадзяржаўная* сістэма вымярэння сыпкіх рэчываў і вадкасцей. Эталонам (стандартам) вымярэння служыла бочка, у якую ўваходзілі чатыры карцы (чвэрці). За парушэнне гэтага эталона ўстанаўліваўся штраф у тры рублі грошаў на карысць Вялікага князя (для параўнання: рабочы конь каштаваў менш, чым 1 рубель).

УСтатуце 1566*упершыню* выкарыстаны тэхнічныя нормы ў сучасным разуменні гэтага паняцця. Да такіх норм можна аднесці габарыты дарогі, правілы дарожнага руху, якія былі ўстаноўлены ў арт. 22 «О дорогахъ старовечныхъ»раздз. 9 Статута «О правах земскихъ»: «Уставуемъ, ижъ дороги звечные маютъ быти водле стародавного обычаю так широки, абы два возъ форманскихъ розминулися, а возъ порожній маетьуступити возу наложоному, пеший ездному, возовому ездный, если бы тесна дорога была яко у местехъ, абоестьли бы хто перед непріятелем утекалъ, тогды возъ застоновеный маеть быти, аж обминуеть. А часу зимнего кгды снегъ бывает велкиий, маютъ поткавшися дорогою половицы делити, а один другого спихати не маеть с дороги».

Падтрыманне шляхоў зносін у належным парадку – адна з мінімальных функцый дзяржавы.Першапачаткова парадак утрымання дарог у належным стане вызначаўся звычаёвым правам, затымпатрабаванне знаходзіць заканадаўчае замацаванне ў Судзебніку 1468 года.У Статуце 1566 года мы бачым далейшае развіццё прававога рэгулявання гэтай функцыі дзяржавы шляхам заканадаўчага рэгулявання памераў дарог і правілаў дарожнага руху.

Нормы арт. 22 раздз. 9 Статута 1566 года былі перанесены і канкрэтызаваны ў арт. 22 раздз. 9 Статута 1588 года. Калі ў Статуце 1566 года шырыня дарогі была вызначана так, каб «два возъ форманскихъ розминулися», то ў Статуце 1588 года была устаноўлена дакладная шырыня дарогі:«Уставуем, иж дороги, великие гостинцы маютъ быти водле стародавного обычаю так широкие, *абы на полтора прута быти могли*»(прут – адзінка вымярэння даўжыні ў ВКЛ, якая была роўнай 4,87 м; падпрутак быў роўны дзясятай частцы прута; прут быў адначасова і адзінкай вымярэння плошчы: глядзі аб гэтым вышэй).

***Статут ВКЛ 1566 года іпершыя айчынныя «прававыя стандарты».***

Адзін з элементаў тэхнічнага рэгулявання – сістэма нарматыўных патрабаванняў да асобных відаў чалавечай дзейнасці, якія звязаны з выкарыстаннем заканамернасцяў прыроды, тэхнікі і тэхналогій [2, с.12]. Нарматыўныя патрабаванні выкладаюцца ў тэхнічных рэгламентах і стандартах, якія выдаюцца дзяржавай, і набываюць пасля гэтага прававую прыроду [11, с.93].У шырокім сэнсе слова сістэма норм права з'яўляецца сістэмай прававых стандартаў, якія датычаць да ўсіх відаў чалавечай дзейнасці.*У вузкім сэнсе слова прававыя стандарты – гэта сістэма патрабаванняў да асобных відаў прававой дзейнасці – праватворчай, правапрымяняльнай, сістэматызацыйнай, інтэрпрэтацыйнайі да вынікаў гэтай дзейнасці –тэкстаў прававых актаў.*Частка прававых стандартаў выкладаецца ў правілах юрыдычнай тэхнікі, якія фарміруюцца ў якасці асобнай прававой з'явы з пераходам ад вуснага да пісьмовага права, хаця сам тэрмін «юрыдычная тэхніка» быў уведзены ў навуковы зварот значна пазней.

Тыпалогія прававых стандартаў [16, с.134], якія ўтрымліваюцца ў Статуце 1566 года, дазваляе вылучыць розныя групы прававых стандартаў. Цікава адзначыць, што асноўная іх маса змешчана ў раздз. 4 Статута 1566 года, які прысвечаны рэгуляванню судовай улады.

У арт. 1 «О выбиранью судей въ повете» раздз. 4 «О судьяхъ и о судехъ» знаходзім моўныя патрабаванні да прававых актаў: «А писаръ земскій маеть по Руску литерами и словы Рускими вси листы и позвы писати, а не иншымъ языкомъ и словы, и такъ маетъ писаръ присегати».У арт. 23 «О сбиванью позвов» таго ж раздзела знаходзім патрабаванні да позвы (іску) і ўказанні на заганы ў тэксце, якія дазваляюцьадказчыку не адказваць па іску, а ў арт. 28 «О позвехъ и о року, якій за позвы будетъ складан, а каждый жалобу свою меновите маетъ на позве описати, и о збиванью возвовъ» падрабязна рэгламентуецца парадак афармлення і ўручэння позвы, парушэнне якогарабіла позву несапраўднай.

Асобны від прававых стандартаў – тэксты прысяг, якія змешчаны ў арт. 1 разд. 4 Статута 1566 года. У дадзеным артыкуле прыводзіцца тэкст прысягі, якую прыносілі суддзя і падсудак, і асобна – тэкст прысягі, якую павінен быў прынесці пісар земскі. Сярод атрыбутаў прысягі пісара якраз і вылучаецца патрабаванне да мовы, на якой пісар павінен быў пісаць лісты і позвы.

У арт. 4 раздз. 4 Статута 1566 года «О возныхъприсезе и врядеихъ»да асобы вознага (судовага следчага і выканаўцы) вылучаецца шэраг патрабаванняў. Ваяводы і староста Жамойцкі павінны былі прызначаць на гэту пасаду *«...тежъ шляхту людей добрихъ веры годных цнотливыхъ оселых въ томъ же повете...».* Возны таксама павінен быў прыносіць прысягу, тэкст якой прыведзены ў дадзеным артыкуле.



Репозиторий ВГУ

Адметная асаблівасць Статута ВКЛ 1566 года – дадаткі, якія былі змешчаны ў канцы тэкста Статута 1566 года. Гэта былі ўзоры прававых дакументаў: дагавору дарэння мужам жонцы рухомых рэчаў, дагавору мены шляхецкай маёмасці, дагавору валодання сямейнай маёмасцю ў выпадку смерці муж (жонкі) да моманта смерці мужа (жонкі), завяшчальнага запісу і інш. Цікава, што ні Статут 1529, ні Статут 1588 гг. аналагічнай структурнай часткі не мелі. У пісьмовых крыніцах тагачаснага еўрапейскага права дадаткі таксама не выкарыстоўваліся.У сувязі з гэтым узнікае мінімум два пытанні: 1) у сувязі з чым узнікла патрэба змясціць узоры прававых дакументаў у Статуце? 2) якой была роля адзначаных прававых дакументаў у прававой сістэме феадальнага грамадства?;

На наш погляд, дадаткі да Статута 1566 года трэба разглядаць у звязцы з судовай рэформай і ўтварэннем земскіх і падкаморскіх судоў. Справа ў тым, што з увядзеннем у дзеянне Статута 1566 года адбыліся змены ў судовых кнігах. Калі па Статуту 1529 года (раздз. 6, арт. 3)запісы рабіліся ў адной кнізе, то са з’яўленнем земскіх і падкаморскіх судоў былі ўведзены розныя актавыя кнігі: паточныя, дэкрэтавыя, запісовыя і г.д. Юрыдычная сіла дакументам надавалася пасля іх запісу у адпаведныя актавыя кнігі. Складальнікі Статута 1566 года добра разумелі цяжкасці, з якімі сутыкаецца судовая ўлада пасля яе рэфармавання,і шляхам размяшчэння ўзораў прававых дакументаў у дадатках да Статута імкнуліся пазбегнуць непатрэбных правапарушэнняў. Тым самым складальнікі Статута 1566 года засведчылі сістэмнае бачанне прававой сістэмы грамадства і высокі ўзровень праватворчай тэхнікі, якой яны валодалі, а таксама веданне судовай практыкі.

Прафесар Юхо І.А. у прадмове да выдання Статута 1566 года звярнуў увагу на дадаткі да Статута і зрабіў выснову, што ўзоры прававых дакументаў былі першымі прававымі актамі, якімі быў пакладзены пачатак прававога ўрэгулявання натарыяльнай дзейнасці, і, разам з тым, *падручнікамі – інструкцыямі, якія вучылі правільнай рабоце***,** што ўскладвалася на судовыя ўстановы[21, с.30 – 31].Мы пагаджаемся с высновамі прафесара Юхо І.А. адносна ролі дадаткаў у зараджэнні натарыяльнай дзейнасці і падручнікаў – інструкцый. Разам з тым,дадаткі да Статута 1566 года, на наш погляд, – гэта яшчэ і*першыя* ў гісторыі айчыннага права прававыя стандартыў сучасным разуменні гэтага паняцця**.**

**Вывады:**Структурныя асаблівасці Статута 1566 года ў параўнанні з будовай Статутаў 1529 і 1588 гг. даюць падставы аднесці дадзеную крыніцу права да звода законаў. Менавіта для звода законаў характэрна ўключэнне ў афіцыйны тэкст выдання некалькіх самастойных крыніц права.Пры гэтым ніводная з уключаных у звод законаў крыніц права не губляе сваёй самастойнасці і ў сукупнасці з іншымі ўтварае якасна новую крыніцу. Высокі узровень юрыдычнай тэхнікі Статута 1566 – сведчанне значнага уплыву тагачаснай прававой дактрыны на змест і форму Статута 1566 года, магчыма, ідэй«дактаров прав чужоземских» Пётра Раізія –«гішпана з Арагона» – і Ратондуса Мялецкага з Вільні.Складальнікі Статута 1566 года выкарысталі самыя дасканалыя на той час правілы праватворчай тэхнікі, што дазволіла на высокім навуковым узроўні сістэматызаваць звычаёвае і пісанае права. У Статуце знайшлі замацаванне тэхнічныя нормы ў сучасным разуменні гэтага паняцця і першыя айчынныя прававыя стандарты.


1. Бибило, В.Н. Политические и правовые аспекты Статута Великого княжества Литовского 1529 г. / Право и демократия: сб. научных трудов. – Вып. 26 /редкол.: В.Н. Бибило (гл.ред.) [ и др.] – Минск: БГУ, 2015. – С. 90 – 107.
2. Вудвард, Д. История развития стандартизации в Великобритании / Д. Вудвард. Пер. с англ. Издательство стандартов, 1975. – 104 с.
3. Голубева, Л.Л. Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 года – помнік прававой культуры і думкі беларускага народа (да 450-годдзя ўвядзення ў дзеянне) / Право и демократия: сб. науч. трудов. – Вып. 27. (2016) / БГУ: [редкол.: В.Н. Бибило (гл. ред. и др.] – Минск: БГУ, 2016. – С. 132–145.
4. Голубева, Л.Л. Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 года – важны этап у станаўленні і развіцці беларускага заканадаўства / Сборник: Статут Великого княжества Литовского, Русского и Жемойтского 1566 г.: к 450-летию издания. Матэрыялы круглага стала – Мінск, 2016. – С.29–48.
5. Зайцева, Е.С. Пределы правового регулирования в правотворческой политике современного российского государства / Е.С. Зайцева // Академический юридический журнал. – 2016. – № 2 (64). – С. 11–17.
6. Ковалева, Н.В. Природа и функции технико-юридических норм / Н.В. Ковалева // Государство и право. – 2016. – № 11. – С. 5–12.
7. Кодан, С.В. Акты систематизации законодательства: юридическая природа и место в системе российского права / С.В. Кодан // Научный ежегодник Института философии и права Уральского отделения РАН. – 2008. – № 8. – С.385–401.
8. Лукьянова, В.Ю. К вопросу о юридической природе технического регламента / В.Ю. Лукьянова // Журнал российского права. – 2007. – № 5. – С.11–24.
9. Миронов, В.О. О соотношении права и законодательства / В.О. Миронов, Н.В. Зин // Вестник международного Института управления. – 2017. – № 3 (145). – С. 46–50.
10. Мурашко, Л.О. Аксиологическое измерение процесса правообразования. М.,1915. Сер. Теория и история государства и права.
11. Нестеров, А.В. О техническом регулировании в России / А.В. Нестеров // Государство и право. – 2009. – № 8. – С. 93–96.
12. Рубцова, М.О. Проблемы кодификации на муниципальном уровне и структура муниципального кодекса / М.О. Рубцова // Советник юриста.– 2017. – № 12.– С. 85–96.
13. Силаев, С.А. К вопросу об окончании длящегося преступления / С.А. Силаев // Российский юридический журнал. – 2013.– № 3(90). – С. 146–153.
14. Статут Великого княжества Литовского, Русского и Жемойтского 1566 г.: к 450-летию издания. Матэрыялы круглага стала. – Мінск, 2016. – С.29–48.
15. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588. Тэксты. Давед. Камент. – Мінск.: Беларус. Сав. Энцыкл..; Рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. Рэд.) і інш. – Мінск.: БелСЭ, 1989.– 573 с.: іл.
16. Строева, О.А. Типология права и правосознания: теоретико-правовая характеристика / О.А. Строева // Вестник Московского университета МВД. – 2017. – № 3. – С. 134–137.


Репозиторий ВГУ

17. Терещенко, Л.К. Концепция правового обеспечения технического регулирования / Л.К. Терещенко, Ю.А. Тихомиров, Т.Я. Хабриева // Журнал российского права. – 2006. – № 9. – С. 3–17.
18. У прадмове да выдання Статута 1588 года, якое ажыццявіла выдавецтва Беларускай савецкай энцыклапедыі ў 1989 годзе, прафесар Юхо І.А. (на старонцы 38) характарызуе Статут 1588 года у якасці аднаго з першых кодэксаў Еўропы. Глядзі: Хаўратовіч, І.П., Падокшын, С.А., Галенчанка, Г.Я., Здановіч, Н.І., Лявонава, А.К., Собаль, Е.В., Трусаў, А.А., Яніцкая, М.М., Юхо, І.А. (Статут і развіццё прававаой думкі) // Статут Вялікага княства Літоўскага 1588. Тэксты. Давед. Камент. – Мінск.: Беларус. Сав. Энцыкл..; Рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) і інш. – Мінск.: БелСЭ, 1989. – 573 с.: іл. Такім чынам, прафесар Юхо І.А. па-рознаму ацэньваў прававую прыроду Статутаў ВКЛ 1566 і 1588 гг.
19. Урванцев, Б.А. Порядок и нормы / Б.А. Урванцев. – М.: Издательство стандартов, 1991.– 240 с.
20. Чашин, А.Н. Форма и содержание правовой доктрины / А.Н. Чашин // Советник юриста. – 1917. – № 9. – С. 75–92.
21. Юхо, І.А. Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 года – самы дасканалы ў Еўропе тагачасны звод законаў // Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 года / Т.І. Доўнар, У.М. Сатолін, Я.А. Юхо; Рэдкалегія Т.І. Доўнар і інш. – Мінск.: Тэсей, 2003. – 352 с.: іл. – с. 7 – 33.

## СОВЕТСКИЙ ОПЫТ НОРМАТИВНОГО ЗАКРЕПЛЕНИЯ ПРАВИЛ (ТРЕБОВАНИЙ) ЮРИДИЧЕСКОЙ ТЕХНИКИ

Е.Н. Швед (Минск, Беларусь)

В условиях модернизации современной правовой системы все более существенную роль приобретают вопросы повышения юридико-технического качества нормативных правовых актов. В этой связи весьма важно систематизировать правила юридической техники и решить вопрос о возможности правового закрепления последних. Правила юридической техники частично закреплены в отечественном законодательстве, чему способствовала многолетняя история технико-юридической подготовки правовых актов, в том числе и в зарубежных странах. В этой связи особый интерес представляет практика правового регулирования юридической техники в советский период.

Еще 22 сентября 1924 года был издан специальных Декрет ВЦИК и СНК РСФСР «О порядке прохождения законопроектов через Президиум Всероссийского Центрального Исполнительного Комитета и Совет Народных Комиссаров» [9], где содержался ряд правил подготовки законопроектов. Кроме того, в правовых актах уровня подзаконного нормотворчества были установлены порядок опубликования, вступления в силу нормативных актов, а также отдельные правила и приемы технико-юридического характера. Среди них постановление ВЦИК РСФСР от 7 июля 1923 г. «О порядке изменения кодексов, утвержденных Всероссийским Центральным Исполнительным Комитетом», Постановление ВЦИК и СНК РСФСР от 29 июля 1929 г. «О работе по кодификации законодательства РСФСР». Последний акт содержал предложение Народному комиссариату юстиции приступить к кодификации действующего законодательства. Пункт 5 данного постановления обращает особое внимание на то, «чтобы законы излагались понятным для широких трудящихся масс языком» [10].

В первые годы Советской власти отсутствовали унифицированные правила юридической техники. Однако в юридической литературе все чаще встречаются заключения о необходимости более глубокого исследования вопросов законодательной техники и, в том числе, отдельных ее правил и требований. Например, С. Перетерский в 1939 году писал о достижении единообразия в разрешении вопросов законодательной техники [11, с. 115].

Заметный «скачек» в развитии нормативного закрепления юридической техники произошел во второй половине XX века. Во многих юридических актах были зафиксированы нормы, определяющие процесс рассмотрения и утверждения правовых актов органами государства, и иные правила, регулирующие правотворческую деятельность этих органов. Нормы же, которые относились к составлению законопроектов, к вопросам стиля, языка, логики, структуры нормативных актов, далеко не всегда имели правовой характер. Д.А. Керимов объясняет это тем, что «они более подвижны, изменяются применительно к конкретным обстоятельствам в зависимости от характера общественных отношений, на регулирование которых направлен проектируемый акт» [5, с. 4–5]. Тем не менее некоторые из них были нормативно закреплены.

Необходимо отметить, что в этот период велась активная работа по нормативному закреплению юридической техники в ряде зарубежных стран. Так, специальные акты были изданы в Польской Народной Республике и Чехословакии. Кроме этого, Совет Министров Болгарии 25 августа 1962 г. принял постановление «Об улучшении систематизации и кодификации законодательства в Народной Республике Болгарии». Позже, в 1973 году, был принят Закон о нормативных актах, а также конкретизирующий и развивающий его Указ Государственного совета «О применении Закона о нормативных актах» от 24 апреля 1974 г. По мнению Б. Спасова, «оба акта установили определенный правовой алгоритм, позволяющий не только регламентировать законодательную технику, но и использовать ее для достижения наиболее благоприятных результатов в процессе законодательной деятельности» [16, с. 70]. В Венгерской Народной Республике 10 ноября 1964 г. было издано постановление правительства «О дальнейшем развитии деятельности по подготовке нормативных актов», на основании которого были разработаны и утверждены «Руководящие начала методики подготовки нормативных актов» и «Руководящие начала редакции нор-



Репозиторий ВГУ